Уладзімір Серпухаў
(Мінск)

Беларускія студэнцкія арганізацыі Віленскага універсітэта (1919-1939)

Пасля аднаўлення дзейнасці Віленскага універсітэта ў 1919 г. ён хутка стаў адзінай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Нягледзячы на тое, што большасць беларускага насельніцтва прадстаўляла беднае сялянства, адукаваныя людзі ў грамадстве мелі пашану. Для кожнай беларускай сям'і было гонарам, калі іх сын або дачка вучацца ва універсітэце. Аднак на шляху да атрымання вышэйшай адукацыі для беларусаў было шмат перашкод. Беларускія сярэднія школы не давалі сваім выпускнікам так званых „правоў публічнасці" або „правоў дзяржаўных школ". Так, да 1928 г. выпускнікі Віленскай беларускай гімназіі, каб паступіць ва універсітэт, былі вымушаны самастойна рыхтавацца да здачы дзяржаўных экзаменаў у польскай гімназіі, каб атрымаць атэстат сталасці. Навучанне ва універсітэце было платным.

Сістэма універсітэцкай адукацыі не задавальняла ўсіх інтэлектуальных патрэб моладзі. Рознабаковае развіццё студэнтаў забяспечвала шырокае кола навуковых гурткоў, карпарацый, літаратурных, тэатральных, музычных, спартыўных і іншых клубаў. Разам з тым існавалі і зямляцкія або правінцыянальныя гурткі — арганізацыі студэнтаў па тэрытарыяльнай прыкмеце. Іх мэтай была сяброўская дапамога ў бытавых і арганізацыйных справах, падтрыманне кантакту з землякамі. Таксама дзейнічалі нацыянальныя студэнцкія арганізацыі, якія аб'ядноўвалі студэнтаў па нацыянальнай прыкмеце. Асновай іх дзейнасці была культурна-асветніцкая праца. Многія студэнты ўваходзілі адначасова ў некалькі арганізацый. Студэнцкія арганізацыі дапамагалі развіваць здольнасці ў залежнасці ад перавагі, знаёміцца і навязваць кантакты з аднадумцамі, рэалізоўваць самыя розныя планы.

Дзейнасць студэнцкіх арганізацый абмяжоўвалі ўставы „Аб акадэмічных школах" Міністэрства веравызнанняў і адукацыі Польшчы. Найбольш значных, дзе агаворваліся правы і абавязкі студэнтаў, было тры

і выходзілі яны ў 1920, 1933 і 1937 гадах[1]. З кожным разам умовы для дзейнасці студэнтаў былі ўсё больш жорсткімі і абмежаванымі.

Студэнты-беларусы ўступалі ў Беларускі студэнцкі саюз (БСС). Ён быў самай значнай і самай масавай беларускай арганізацыяй у Віленскім універсітэце.

Яшчэ ў 1920 г. у Віленскім універсітэце стварыўся гурток студэнтаў-беларусаў, які хутка перарос у БСС і з 1921 г. пачаў дзейнічаць як самастойная і сур'ёзная арганізацыя, якая хоць і дэкларавала ў сваім статуце апалітычнасць, тым не менш, востра рэагавала на значныя падзеі ў грамадска-палітычным жыцці беларусаў як на тэрыторыі Польшчы, так і ў Савецкай Беларусі ды ў замежжы.

У статуце кожнай студэнцкай арганізацыі агаворвалася яе структура. Органамі кіраўніцтва вызначаны агульны сход, праўленне, рэвізійная камісія. Прадстаўнікоў гэтых органаў выбіраюць большасцю галасоў усе члены студэнцкай арганізацыі на агульным сходзе, які з'яўляецца вышэйшай уладай і апошняй інстанцыяй у рашэнні спрэчных пытанняў. Да кампетэнцыі праўлення належыць выканаўчая і прадстаўнічая ўлада, кіраўніцтва дзейнасцю арганізацыі, прыняцце ў яе члены і выключэнне. Пасяджэнні праўлення праводзяцца па неабходнасці, але не менш двух разоў у месяц. Рэвізійная камісія правярае і кантралюе дзейнасць арганізацыі. Яна складецца з кіраўніка, двух членаў і двух намеснікаў з ліку членаў арганізацыі. Пасяджэнні рэвізійнай камісіі адбываюцца адзін раз у квартал.

Спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць паміж членамі арганізацыі, вырашае Таварыскі суд. Ён складаецца з пяці членаў арганізацыі[2].

Згодна пастановы сената Віленскага універсітэта кожная студэнцкая арганізацыя павінна была мець свайго куратара з ліку універсітэцкіх выкладчыкаў, праз якога вёўся нагляд за дзейнасцю арганізацыі. Правы і абавязкі куратара агаворваліся ў спецыяльных „Указаннях універсітэцкіх улад па кантраляванню за дзейнасцю студэнцкіх арганізацый". Кандыдатуру куратара маглі прапаноўваць і самі студэнты, але рашэнне аб зацвярджэнні прымаў сенат універсітэта.

Куратар абавязаны кантраляваць дзейнасць студэнцкай арганізацыі, каб яна не выходзіла за рамкі закону і статута арганізацыі. Куратар павінен апекавацца справамі арганізацыі і ўважліва сачыць за яе дзейнасцю, быць пасрэднікам паміж праўленнем арганізацыі і універсітэцкімі ўладамі[3].

[1] Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego Rzeczypospolitej Polskiej, nr 20 (40) z 25.11.1920 r., s. 260-279; nr 4 z 13.05.1933 r., s. 156-163; nr 14 z 31.12.1937 r., s. 485-489.

[2] Lietuvos Centrinis Valstybės Archyvas (далей: LCVA), ф. 175, воп. 15, спр. 58, арк. 4-5, 62-65.

[3] LCVA, ф.175, воп. 1, спр. IA577, арк. 269.

З мэтай нагляду за арганізацый апошнія прад'яўляюць акадэміцкаму сенату склад праўлення, адрас памяшкання арганізацыі, паведамляюць аб зменах у статуце, складзе праўлення ці адрасе. Штогод арганізацыі абавязаны прадстаўляць у сенат справаздачы са сваёй дзейнасці за год, своечасова паведамляць куратара аб маючых адбыцца мерапрыемствах, сходах і інш. У выпадку адсутнасці куратара на агульным сходзе або пасяджэнні праўлення, праўленне абавязана прадставіць куратару пратакол пасяджэння ці сходу. За адхіленне ад законаў ці нормаў статута арганізацыі куратар мог вызваліць ад займаемай пасады любога члена праўленна ці выключыць члена арганізацыі з яе складу[4].

Куратарамі БСС былі вельмі вядомыя і паважаныя прафесары не толькі ў Вільні, але і ў Польшчы ды за яе межамі. З першага дня існавання БСС і да сярэдзіны 1932 г. ім апекаваўся прафесар неўралогіі Станіслаў Уладычка.

Станіслаў Уладчыка прысутнічаў на многіх пасяджэннях ураду БСС, адстойваў інтарэсы беларускай моладзі перад вышэйстаячымі ўладамі, садзейнічаў развіццю беларускай культуры ў Заходняй Беларусі, актывізаваў дзейнасць беларускіх студэнцкіх арганізацый па правядзенню адукацыйнай і выхаваўчай работы сярод шырокіх народных мас. Аб яго папулярнасці сведчыць тое, што кожны год, калі трэба было перавыбіраць куратара, сябры БСС выказвалі свайму куратару шчырую падзяку за працу і хадайнічалі перад рэктарам і сенатам універсітэта, каб доктар, а пазней і прафесар Уладычка працягваў і надалей апекавацца справамі беларускага студэнцтва.

У час унутранага ідэалагічнага крызісу ў Беларускім студэнцкім саюзе прафесар Уладычка адмаўляецца ад куратарства і з чэрвеня 1932 г. ды да сярэдзіны 1939 г. функцыі куратара выконваў прафесар славянскай філалогіі Эрвін Кашмідэр[5]. Прафесар Кашмідэр з'яўляўся куратарам яшчэ адной беларускай студэнцкай арганізацыі Віленскага універсітэта — Таварыства прыяцеляў беларусаведы (ТПБ) — на працягу амаль ўсёй яго дзейнасці з канца 1933 да сярэдзіны 1939 г.

Эрвін Кашмідэр прысутнічаў на многіх пасяджэннях праўленняў арганізацый, куратарамі якіх ён з'яўляўся. Ён шчыра апекаваўся справамі беларускіх студэнтаў, прыкладаў усе свае намаганні на тое, каб аб'ектыўна знаходзіць выйсце ў канфліктных сітуацыях, якія ўзнікалі часам сярод сяброў беларускіх студэнцкіх арганізацый, куратарам якіх ён быў. І толькі па прычыне ад'езду на сталае жыхарства з Польшчы ў нямецкі Мюнхен верны сябра беларускіх студэнтаў быў вымушаны адмовіцца ад куратарства.

[4] LCVA, ф.175, воп. 1, спр. IA577, арк. 270.
[5] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA574, арк. 279.

З ад'ездам доктара Кашмідэра з Вільні БСС і ТПБ апынуліся без куратара. У сувязі з гэтым рашэннем сената і рэктара Віленскага універсітэта ад 23 чэрвеня 1939 г. куратарам вышэйзгаданых беларускіх студэнцкіх арганізацый быў зацверджаны дацэнт Віленскага універсітэта, мастак Ежы Гопэн[6]. Але яго дзейнасць у якасці апекуна студэнтаў-беларусаў была нядоўгай, бо існаваць як беларускім студэнцкім арганізацыям, так і самому Віленскаму універсітэту заставалася каля шасці месяцаў.

Ежы Гопэн — прафесійны мастак, які нарадзіўся ў Коўне, атрымліваў адукацыю ў Коўне, Кракаве, Пецярбургу, быў далёкі ад ідэалогіі беларускага студэнцтва[7]. За кароткі час свайго куратарства ён нават не паспеў нічога зрабіць значнага для беларускіх студэнтаў. Тон арганізацыі задавалі самі студэнты.

Юрыдычна БСС з'яўляўся культурна-асветніцкай арганізацыяй, мэтамі і задачамі якой было распаўсюджванне асветы сярод беларускага насельніцтва не толькі ў Вільні, але і ў самых аддаленых кутках праз чытанне лекцый, арганізацыю тэатральных пастановак, сустрэч з абмеркаваннямі самых розных пытанняў, а таксама ўзаемадапамога сваім сябрам і супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі студэнтаў. Найбольш цесна саюз супрацоўнічаў з саюзамі студэнтаў-украінцаў і студэнтаў-літоўцаў Віленскага універсітэта. Яны рэгулярна арганізоўвалі сумесныя мерапрыемствы. Абавязковай традыцыяй стаў штогадовы баль трох саюзаў.

Арганізацыя садзейнічала пашырэнню нацыянальнай свядомасці сярод сваіх членаў і падрыхтоўцы іх да культурнай, грамадскай і асветніцкай працы на тэрыторыях, дзе пражывае беларускае насельніцтва.

Саюз трымаўся незалежніцкіх пазіцый і не ішоў адкрыта на супрацоўніцтва з тымі, ці іншымі палітычнымі сіламі. Рэгулярныя пратэсты супраць рэпрэсій беларускай інтэлігенцыі з боку савецкіх улад на тэрыторыі БССР, а таксама нязгода падтрымліваць польскі санацыйны ўрад сведчыць аб палітычных арыентацыях саюза. Тым не менш, БСС пастаянна знаходзіўся пад ідэалагічным уплывам некай палітычнай плыні. Самымі вызначальнымі былі Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) і Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Пазней, калі стварылася група Радаслава Астроўскага і Антона Луцкевіча, якая пайшла на супрацоўніцтва з польскай уладай, яна імкнулася мець таксама свае ўплывы на беларускіх студэнтаў. У выніку ўнутранага канфлікту некалькі членаў саюза выйшлі з яго складу і стварылі сваю асобную арганізацыю — студэнцкую карпарацыю „Скарынія".

[6] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 58, арк. 10; ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 9.
[7] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IBв850, арк. 4-5.

У студзені 1930 г. у Празе адбыўся з'езд Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый, на якім прысутнічалі і члены БСС у Вільні. З'езд прыняў рэзалюцыю з пратэстам супраць пануючага палітычнага становішча ў БССР і праследавання беларускіх нацыянальных дзеячаў, а таксама дамагаўся паляпшэння становішча беларускіх студэнтаў у Польшчы. Падчас агульнага сходу БСС, які прайшоў у красавіку 1930 г., быў прыняты план на бліжэйшы час. Асноўнымі накірункамі работы саюза былі вызначаны: 1) энергічная барацьба за абмежаванне ўплыву камуністаў і хрысціянскіх дэмакратаў на саюз; 2) выключэнне з саюза членаў, якія супрацоўнічаюць з Беларускім сялянска-работніцкім пасольскім клубам; 3) падтрымка акцыі беларусізацыі царквы ў Польшчы, а для гэтага дэлегіраваць сваіх прадстаўнікоў у Цэнтральны беларускі праваслаўны камітэт; 4) прыкласці ўсе намаганні, каб рэгулярна выходзіў часопіс „Студэнцкая думка"; 5) падрыхтоўка плану лекцый і тэатральных пастановак; 6) прыкласці намаганні для знаходжання матэрыяльных сродкаў для вядзення культурна-асветніцкай працы Беларускім студэнцкім саюзам; 7) падтрымка беларускіх арганізацый, арганізаваных Р. Астроўскім[8].

Апошні пункт сведчыў аб збліжэнні з Польшчай, і, адпаведна, пэўнай адмове ад незалежнасці Беларусі. Гэты накірунак у дзейнасці БСС і стаў галоўнай прычынай размежавання ў радах арганізацыі. Так, у 1931 г. з часткі былых членаў саюза ўтварылася новая карпарацыя „Скарынія". Кіраўніцтва „Скарыніі" прызнавала польскую дзяржаўнасць і выказвалася за супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. Куратарам быў прызначаны прафесар Ежы Панейка[9]. Ён спецыялізаваўся на юрыдычных навуках. З 1910 г. — доктар юрыдычных навук. У асабовых дакументах падаецца, што ён быў рускі[10].

У склад карпарацыі ўваходзіла каля 20 чалавек. БСС застаўся пад ідэалагічным уплывам БХД. Такая сітуацыя негатыўна адбівалася на кансалідуючай працы беларускага студэнцтва Віленскага універсітэта.

Абедзве арганізацыі мелі свае друкаваныя органы. У Вільні выдавалася „хадэцкая" „Студэнцкая думка" і „санацыйная" „Новая варта". Яны рэгулярна вялі супрацьборства паміж сабой.

22 чэрвеня 1934 г. рашэннем сената была забаронена дзейнасць студэнцкай карпарацыі „Скарынія"[11]. Карпарацыя была распушчана па прычыне поўнай дэмаралізацыі адносінаў унутры арганізацыі, выкліканага ўплывамі старэйшага беларускага грамадства. Супрацьборства

[8] K.Gomółka, *Białorusini w II Rzeczypospolitej*, [w:] „Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia", nr XXXI, Gdańsk 1992, s. 113.

[9] LCVA, ф. 175, воп. 14, спр. 456, арк. 1-5.

[10] LCVA, ф. 175, воп. 14, спр. 456, арк. 27.

[11] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 78.

некаторых груп беларускага старэйшага грамадства ўцягвала ў свае ўплывы моладзь „Скарыніі", чым давялі да найгоршага стану адносіны паміж членамі карпарацыі.

А ў перыяд з 1 мая 1934 г. па 1 сакавіка 1935 г. былі зарэгістраваны новыя 15 таварыстваў, у тым ліку Беларускае студэнцкае таварыства імя Ф. Скарыны (БСТ), заснаванае часткай больш памяркоўных членаў былой „Скарыніі". Яго куратарам быў доктар Вітальд Сьвіда[12].

БСТ імя Ф. Скарыны паўстала замест распушчанай у маі 1934 г. студэнцкай карпарацыі „Скарынія". Гэта арганізацыя аб'яднала беларускую студэнцкую моладзь, якая станоўча ці лаяльна ставілася да польскіх улад.

У статуце БСТ імя Ф. Скарыны акрэслены яе мэты: выхаванне з кожнага члена арганізацыі сапраўднага грамадзяніна, адданага працы на карысць народу і айчыне; узаемная інтэлектуальная дапамога праз чытанне рэфератаў, правядзенне навуковых сходаў і матэрыяльная дапамога. Дасягненне мэт планавалася наступнымі сродкамі: праз узаемадзеянне і супрацоўніцтва членаў таварыства, абмен думкамі, выхаванне дысцыплінаванасці, а таксама праз навуковую, грамадскую і мастацкую дзейнасць[13].

І карапарацыя „Скарынія", і БСТ імя Ф. Скарыны па сутнасці былі вельмі падобнымі. Структура іх дзейнасці палягала на вядзенні культурна-асветніцкай работы членамі арганізацыі як сярод студэнтаў-беларусаў, так і на ўсёй тэрыторыі Польшчы. Адрозненне ад БСС было толькі ў ідэалогіі, а таксама ў размаху дзейнасці апошняга. БСС карыстаўся большай падтрымкай сярод беларускага грамадства і быў больш уплывовай арганізацыяй.

З аслабленнем дзейнасці групы Р. Астроўскага і А. Луцкевіча ў 1935 г. назіралася і аслабленне працы БСТ імя Ф. Скарыны.

Рашэннем сената Віленскага універсітэта ад 19 чэрвеня 1936 г. на аснове параграфа 24 пункт 1 распараджэння міністра веравызнанняў і адукацыі Польшчы „Аб акадэмічных таварыствах" было распушчана БСТ імя Ф. Скарыны[14].

З 1933 г. на базе Віленскага універсітэта заснавалася Таварыства прыяцеляў беларусаведы. У яго склад увайшлі многія члены БСС. Гэтыя дзве арганізацыі былі падобныя, але калі ТПБ засяроджвала сваю ўвагу пераважна на навуковай дзейнасці ў межах універсітэта, то БСС займаўся культурна-асветніцкай дзейнасцю сярод самых шырокіх беларускіх народных мас. Тым не менш, гэтыя дзве беларускія маладзёжныя арганізацыі вялі цеснае супрацоўніцтва.

[12] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 88.
[13] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 14, арк. 68.
[14] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 27.

27 лістапада 1933 г. статут ТПБ быў пададзены сенату універсітэта на зацвярджэнне. На гэты час у арганізацыі было 23 члены. У пазнейшы час колькасць членаў арганізацыі складала каля 20 чалавек[15].

Характар дзейнасці таварыства вызначаўся як навуковы[16]. „Навуковая дапамога для членаў выражалася ў паглыбленні ведаў па беларусазнаўству праз арганізаванне навуковых сходаў і доступ да бібліятэкі гуртка"[17].

Яго мэты: пашырэнне ведаў у галіне беларусазнаўства (мова, літаратура, гісторыя, этнагарфія і інш.), навуковая дапамога членам арганізацыі ў навучанні, падтрымка сувязей з беларускімі навуковымі дасягненнямі.

Сродкі дасягнення пастаўленых мэт бачыліся ў вывучэнні і аналізе вядомых беларускіх твораў, выданні ўласных распрацовак і матэрыялаў па гісторыі, мове, літаратуры і этнаграфіі, азнаямленні з архівамі, музеямі, біблятэкамі, з беларускім тэатрам і прэсай, арганізацыі бібліятэкі, падтрыманні сувязей з беларускімі гурткамі польскіх універсітэтаў.

Членам таварыства мог стаць кожны студэнт Віленскага універсітэта, але, як правіла, імі станавіліся выхадцы з беларускіх сялянскіх сямей.

Куратарамі ТПБ былі Эрвін Кашмідэр і Ежы Гопэн. Праца таварыства вялася па секцыях: філалагічная, этнаграфічная, літаратурная, гістарычна-эканамічная[18].

У рамках секцый вялася актыўная праца па вызначаных накірунках: арганізоўваліся навуковыя сходы, тэматычныя вечарыны, дыскусійныя сустрэчы, чытанні лекцый, абмеркаванні літаратурных твораў.

За час дзейнасці таварыства былі прачытаны лекцыі на розныя тэмы, звязаныя з беларускай гісторыяй, мовай, літаратурай, этнаграфіяй. Яны былі вельмі актуальнымі і неабходнымі для слухачоў. Дарэчы, на публічных лекцыях слухачамі маглі быць не толькі студэнты, але і ўсе жадаючыя. Лекцыі спрыялі развіццю нацыянальнай свядомасці, фарміраванню ўяўленняў аб самабытнасці беларусаў, адметнасці ад сваіх суседзяў.

Беларускія студэнцкія арганізацыі, у тым ліку і ТПБ, увесь час сваёй дзейнасці перажывалі цяжкае матэрыяльнае становішча. Гэта тычылася і ўсяго беларускага нацыянальнага руху. Аб матэрыяльных цяжкасцях таварыства сведчаць бюджэтныя справаздачы, у якіх рэгулярна прасочваецца адсутнасць неабходных сум на выданне навуковых матэрыялаў ці пашырэнне бібліятэкі і інш[19]. Невялікую частку складалі членскія ўзносы і даходы з праведзеных вечарын.

[15] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 83.
[16] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 4.
[17] LCVA, ф.175, воп. 15, спр. 7, арк. 39.
[18] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 70.
[19] гл.: LCVA. ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 73, 81.

Адной з праблем была адсутнасць нармальнага памяшкання для працы. Увесь час ТПБ тулілася па закутках: то ў памяшканні, дзе праводзіліся семінары для студэнтаў Віленскага універсітэта па славістыцы, то побач з БСС[20]. На просьбы выдзеліць адпаведнае памяшканне для ТПБ рэктарат універсітэта адказваў адмоўна[21]. Развіццё беларускага нацыянальнага руху амаль не падтрымлівалася польскімі ўладамі.

Члены ТПБ вялі сістэматычную працу па збіранню этнаграфічнага і мовазнаўчага матэрыялу на тэрыторыі Заходняй Беларусі[22]. Вынікам гэтай працы было з'яўленне ў бібліятэцы арганізацыі калекцыі этнаграфічных і мовазнаўчых матэрыялаў. Штогод яе папаўнялі новыя матэрыялы, назапашаныя беларускімі студэнтамі.

Сваю дзейнасць ТПБ спыніла напачатку другой сусветнай вайны ў верасні 1939 г.

13 чэрвеня 1929 г. да рэктара Віленскага універсітэта была накіравана просьба легалізаваць новую студэнцкую арганізацыю — Беларускае студэнцкае краязнаўчае таварыства (БСКТ)[23]**.** Пад заявай свае подпісы паставілі студэнты універсітэта, якія адначасова ўваходзілі ў склад БСС: В. Уласевіч, Я. Хвораст, Б. Кіта, Е. Казлоўская, П. Шчасны. Дзякуючы намаганням беларускай моладзі ўдалося ў гэтым жа годзе адчыніць у Віленскім універсітэце кафедру беларусазнаўства.

Па статуту БСКТ мэтамі былі вызначаны паглыбленне ведаў па беларускай геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры і культуры[24]. Для гэтага таварыства арганізоўвала чытанні і дыскусійныя рэфераты, экскурсіі, прадстаўленні і канцэрты, выдавала ўласны друкаваны орган, мела бібліятэку, арганізоўвала секцыі, аддзелы, аказвала навуковую і матэрыяльную дапамогу членам таварыства. Членам таварыства мог стаць кожны студэнт беларускай нацыянальнасці. Тэрыторыяй дзейнасці арганізацыі вызначалася ўся тэрыторыя Польшчы.

Узнікла яшчэ адна арганізацыя беларускіх студэнтаў — Саюз студэнтаў-народнікаў імя Францішка Багушэвіча ў Вільні (ССН)**.** Зварот да рэктара ад заснавальнікаў з просьбай зарэгістраваць саюз і зацвердзіць статут быў прыняты на арганізацыйным сходзе 26 студзеня 1930 г. Пад ім падпісаліся Т. Куніцкі, С. Станкевіч, М. Амельяновіч, А. Скурко, М. Шкялёнак, А. Барыс, Л. Ненартовіч, К. Глінскі, В. Чатыркава, С. Сарока[25].

[20] гл.: LCVA. ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 4, 18.
[21] гл.: LCVA. ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 7.
[22] гл.: LCVA. ф. 175, воп. 15, спр. 7, арк. 70.
[23] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA557, арк. 314.
[24] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA557, арк. 315
[25] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA557, арк. 396.

Мэтамі ССН было падтрыманне цесных сувязей з народніцкім рухам і культурна-асветніцкая праца на вёсцы, работа па паглыбленню і пашырэнню ідэалогіі народнікаў[26].

Пастаўленыя мэты дасягаліся праз самавыхаваўчую працу сваіх членаў у арганізацыі, правядзенне дыскусійных сходаў, чытанняў, таварыскіх вечарын, экскурсій; удзел у грамадскай рабоце сярод насельніцтва праз арганізаванне чытанняў, арганізацыю курсаў, вечарніц; праз заснаванне культурна-асветніцкіх арганізацый на вёсцы, перш за ўсё маладзёжных гурткоў; наладжванне стасункаў з іншымі студэнцкімі і грамадскімі арганізацыямі; дэлегаванне сваіх прадстаўнікоў на канферэнцыі, з'езды і сходы, як акадэмічныя, так і грамадскія; арганізаванне ўласнай бібліятэкі і чытальні; выдаванне свайго часопіса і інш.

Тэрыторыяй дзейнасці ССН была ўся Польшчы, а месцазнаходжаннем праўлення — Вільня.

Матэрыяльны фонд ССН складалі членскія ўзносы, ахвяраванні, выручка ад праведзеных масавых забаўляльных і культурных мерапрыемстваў і іншыя даходы.

Членамі гуртка маглі стаць усе жадаючыя студэнты беларускай нацыянальнасці, якія рэгулярна плацяць членскія ўзносы.

Дзейнічалі самыя розныя фонды, які займаліся падтрымкай студэнцкай моладзі. Але амаль што ўсе сродкі, накіраваныя ў адрас Віленскага універсітэта, ішлі на карысць польскіх студэнцкіх арганізацый, якія стаялі на пазіцыях польскай дзяржаўнасці і актыўна распаўсюджвалі такія ідэі сярод студэнцкай моладзі універсітэта. Беларускі студэнцкі саюз і іншыя арганізацыі нацыянальных меншасцей да такіх не адносіліся і таму ўвесь час сваёй дзейнасці знаходзіліся ў цяжкіх матэрыяльных умовах[27].

Гэта быў час, калі інтэнсіўныя ўплывы розных ідэалагічных плыняў на беларускую моладзь вылiваліся ў канфлікты і нелады. З'яўляліся новыя студэнцкія арганізацыі, якія павінны былі стаць плацдармам для чарговай ідэалагічнай апрацоўкі. Як паказала гісторыя, многія з іх былі зачынены па прычыне слабой дзейнасці па накірунках, аб якіх было сказана ў статутах. Гэта тычыцца двух вышэйзгаданых апошніх арганізацый.

Асобнай катэгорыяй студэнцкіх аб'яднанняў вылучаюцца зямляцтвы або так званыя правінцыянальныя арганізацыі. Арганізацый, якія аб'ядноўвалі студэнтаў з беларускіх зямель, у Віленскім універсітэце было некалькі. Варта адзначыць, што сярод мэт і задач большасці з іх беларуская нацыянальная ідэя не прасочвалася. Прааналізаваўшы спісы

[26] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA557, арк. 397.
[27] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 24.

членаў такіх арганізацый можна зрабіць выснову, што большасць складала польская моладзь.

Гурток, які аб'ядноўваў студэнтаў Віленскага універсітэта, якія паходзілі з Гродна і яго наваколля, бярэ свой пачатак з 1924 года[28]. Праўленне віленскай секцыі студэнцкага гуртка Гродзенскай зямлі просіць рэктара Віленскага універсітэта легалізаваць дзейнасць секцыі на тэрыторыі універсітэта 26 мая 1924 года[29]. Са статута арганізацыі вынікае, што Гурток гродзенцаў з'яўляецца саюзам студэнцкай моладзі і мэта яго аб'ядноўваць студэнцкую моладзь з Гродзеншчыны ў адно цэлае. Мэта дасягаецца праз знаёмства з гісторыяй, геаграфіяй і этнаграфіяй Гродзеншчыны; праз стварэнне бібліятэк, чытанне навуковых рэфератаў, арганізацыю краязнаўчых экскурсій, матэрыяльную дапамогу сваім членам, праз таварыскія сходы.

Такія амбіцыёзныя мэты былі апраўданымі. Нельга не звярнуць увагу на той факт, што арганізацыя гэта аб'ядноўвала польскіх студэнтаў Гродзеншчыны. У 7 параграфе статута арганізацыі запісана, што членам гуртка мог быць кожны слухач Віленскага універсітэта, паляк звязаны з Гродзеншчынай.

Заснавальнікі арганізацыі самі звярнуліся да прафесара Станіслава Касцялкоўскага з просьбай быць куратарам, матывуючы просьбу тым, што ён паходзіць з Гродна, і апошні выказаў згоду[30].

С. Касяцялкоўскі скончыў Віленскі і Кракаўскі універсітэты, атрымаў ступень доктара філасофіі, выкладаў польскую мову ў віленскіх школах. З 1921 г. працаваў у Віленскім універсітэце. Кіраваў гістарычным аддзяленнем гуманітарнага факультэта[31].

У 1927 г. статут арганізацыі часткова быў зменены і ў назве арганізацыі ўжо няма слоў „польскі" і „членам гуртка можа быць паляк" і такім чынам можна зрабіць выснову, што ў арганізацыю маглі ўступаць усе студэнты Віленскага універсітэта, якія паходзілі з Гродзеншчыны, якія не лічылі сябе палякамі[32]. Але сярод мэтаў гуртка захавалася вызначэнне „выхоўваць на грунце польскай дзяржаўнасці". Можна ўявіць, што такія змены былі накіраваны на тое, каб яшчэ маласвядомая беларуская моладзь трапляла пад апеку і выхоўвалася ў духу польскага патрыятызму.

У розны час колькасць членаў гуртка мянялася. Напрыклад, у 1932 г. было 60 членаў, а ў 1937 г. у гурток уваходзіла 36 чалавек.

У 1933 г. гурток прайшоў перарэгістрацыю і з 21 снежня 1933 г. пачаў сваю дзейнасць зноў. У гэты час у склад гуртка ўваходзілі 23 чала-

[28] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 116.
[29] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 114.
[30] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 108.
[31] LCVA, ф. 175, воп. 14, спр. 171, арк. 44.
[32] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 104-107.

векі. Па зменененаму статуту гурток з'яўляўся апалітычнай арганізацыяй культурна-асветніцкага характару[33]. Тэрыторыяй дзейнасці гуртка быў вызначаны горад Вільня, Гродзенскі павет і некаторыя суседнія. Задача гуртка істотна не змянілася: вядзенне работы па павышэнню этычнага ўзроўню, грамадзянскага пачуцця, культурна-асветніцкая праца ў рэгіёне, а таксама сяброўская ўзаемадапамога.

Прасачыць нацыянальнасць членаў гэтай арганізацыі з'яўляецца складаным. У асабовых справах студэнтаў указвалася з іх слоў толькі родная мова і веравызнанне. Што тычыцца студэнтаў, якія ўваходзілі ў склад арганізацый гэтай катэгорыі, то пераважная іх большасць вызначала роднай мовай польскую і вызнавалі каталіцкую рэлігію.

Праца гуртка вялася па розных накірунках на працягу ўсяго часу яго дзеяння ў культурна-асветніцкай галіне, пераважна шляхам лекцый і сустрэч.

Чытанні адбываліся на розныя тэмы, але, натуральна, былі больш звязаны з вывучаемымі спецыяльнасцямі студэнтаў-членаў гуртка. Гэта лекцыі па медыцыне і праву. Асаблівай актыўнасцю вылучыліся студэнты А. Драбняк і Т. Бянецкі. Летам 1935 г. яны прынялі ўдзел у двух экспедыцыях з польскімі студэнцкімі гурткамі па Вілейскім павеце. За час вандровак прачыталі разам 249 лекцый. А ў жніўні таго ж года А. Драбняк на тэрыторыі Шчучынскага павета Наваградскага ваяводства правёў 48 сустрэч у вёсках і мястэчках. Тэмамі чытанняў былі: гігіена, п'янства, туберкулёз, венерычныя хваробы. Нават у час навучальнага года актыўны А. Драбняк чытаў лекцыі ў Віленска-Трокскім павеце ў выхадныя і святочныя дні. Асаблівую ўвагу надавалі члены гуртка працы сярод вясковага насельніцтва.

Каб аб'яднаць членаў гуртка, бліжэй пазнаёміць, праўленне гуртка арганізоўвала экскурсіі па цікавых мясцінах краю, рабіла паходы ў кінатэатры Вільні, музычны тэатр. Рэгулярнымі сталі т.зв. „чорныя кавы" і штогадовыя акадэміцкія балы, арганізаваныя ў памяшканні афіцэрскага клуба ў Гродне. З гэтай мэтай кіраўніцтва гуртка наладзіла кантакт з арганізацыяй былых выхаванцаў гімназіі імя А. Міцкевіча ў Гродне. Падчас калядных свят у 1935 г. у Гродне быў арганізаваны цыкл лекцый для абітурыентаў і іх бацькоў і апекуноў. Яны мелі, галоўным чынам, інфармацыйны характар. Лектарамі сталі члены гуртка Л. Мілкоўскі (юрыдычны факультэт), С. Гражэвіч (матэматычна-прыродазнаўчы факультэт), Ю. Матысік (медыцынскі факультэт), Т. Бянецкі (гуманітарны факультэт). Штогод члены гуртка арганізоўвалі вечары памяці сваёй зямлячкі Э. Ажэшкі.

На працягу ўсяго перыяду існавання гуртка былі праблемы з памяш-

[33] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 32, арк. 95-97.

каннем, уласнага не было. Рэгулярна не хапала фінансавых сродкаў на аплату арэнды. Сходы членаў гуртка адбываліся ў памяшканні польскіх школ Вільні. Матэрыяльныя сродкі здабываліся рознымі шляхамі, але магчымасцей у простых студэнтаў было нямнога. Ім самім даводзілася плаціць за навучанне ва універсітэце. Ладзілі яны вечарыны, канцэрты, акадэмічныя балі, уваход на якія быў па недарагіх білетах. Некалькі разоў карысталіся дапамогай магістрата горада Гродна. З атрыманых сродкаў купляліся навуковыя кнігі ў бібліятэку гуртка, а таксама выдзяляліся часовыя дапамогі членам гуртка.

З пачаткам другой сусветнай вайны гурток студэнтаў-гродзенцаў Віленскага універсітэта спыніў сваю дзейнасць канчаткова.

Саюз студэнтаў Наваградскага ваяводства і былой Мінскай зямлі Віленскага універсітэта адносіцца таксама да катэгорыі зямляцкіх або правінцыянальных студэнцкіх арганізацый. Структура яго дзейнасці падобная да гуртка студэнтаў-гродзенцаў.

Першай спробай легалізаваць арганізацыю быў зварот ад слухачоў Віленскага універсітэта — арганізацыйнага камітэта Студэнцкага гуртка Наваградскай зямлі (спачатку так называўся) да рэктара з просьбай зацвердзіць статут новай арганізацыі 13 мая 1925 года[34].

Мэтай Саюза студэнтаў Наваградскага ваяводства і былой Мінскай зямлі Віленскага універсітэта з'яўлялася аб'яданне моладзі, якая адчувае сваю сувязь з Наваградскай зямлёй ці Міншчынай, а таксама ўзаемадапамога, самаадукацыя і культурна-асветніцкая дзейнасць. Куратарамі наваградцаў былі прафесары Вітальд Станевіч і Мар'ян Масоніус[35].

Лозунг саюза — Бог, Айчына, Навука, Маральная чысціня. Мэты саюза — аб'яднанне студэнцкай моладзі Наваградскага ваяводства, таварыская дапамога, самаадукацыя, культурна-асветніцкая праца на тэрыторыі Наваградчыны і падтрымка цеснага кантакту з насельніцтвам Наваградчыны. Сродкі дасягнення мэт — правядзенне навуковых і таварыскіх сходаў, чытанняў, лекцый, канцэртаў і экскурсій, арганізацыя навукова-грамадскіх секцый, правядзенне мерапрыемстваў з даходамі[36]. Культурна-асветніцкую дзейнасць члены саюза актыўна вялі на вёсцы ў час святаў і канікул.

Саюз з'яўляўся апалітычнай арганізацыяй. Аднак фактычна апалітычнасць толькі дэкларавалася статутам. Практычна ўсе студэнцкія арганізацыі прымалі ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краю.

Членам Саюза студэнтаў Наваградскага ваяводства і былой Мінскай зямлі Віленскага універсітэта мог стаць кожны грамадзянін Польшчы

[34] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 329.
[35] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 24, арк. 14.
[36] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 330.

— студэнт, хрысціянін, які паходзіць або адчувае сувязь з Наваградскай зямлёй. Відавочна, што яўрэі не маглі ўступаць у саюз. Сапраўдны член не мог адносіцца да іншых тэрытарыяльных гурткоў. Ганаровых членаў абіраў агульны сход гуртка за пэўныя заслугі.

Год 1936 стаў часам росту нацыяналістычных і антысемітскіх настрояў сярод моладзі[37]. 52 студэнцкія арганізацыі выказаліся за асобнае месца пражывання для яўрэйскіх студэнтаў.

Група студэнтаў Віленскага універсітэта, якіх аб'ядноўвала паходжанне з Дзісненскага павета, вырашылі аб'яднацца ў студэнцкі Гурток дзіснян і прад'явілі праект статута сваёй арганізацыі на зацвярджэнне сената Віленскага універсітэта 16 мая 1931 г.

19 чэрвеня 1931 г. акадэмічным сенатам быў зацверджаны статут Гуртка студэнтаў-дзіснян Віленскага універсітэта, а таксама яго куратар — прафесар Віленскага універсітэта Тадэвуш Чыжоўскі[38].

Т. Чыжоўскі скончыў філасофскі факультэт Львоўскага універсітэта, атрымаў ступень доктара філасофіі. Працаваў у камісіі па апрацоўцы статута Віленскага універсітэта ў 1919 годзе[39], пазней — у Міністэрстве веравызанняў і адукацыі ў якасці саветніка, а затым кіраўніка дэпартамента навукі і вышэйшых школ. З 1923 г. — прафесар філасофіі гуманітарнага факультэта Віленскага універсітэта. У 1933-1935 гг. — прарэктар Віленскага універсітэта. У 1921-1923 гг. — кіраўнік Польскага псіхалагічнага таварыства ў Варшаве. Працаваў кіраўніком Віленскага філасофскага таварыства. Аўтар вялікай колькасці навуковых прац[40].

Гурток студэнтаў-дзіснян Віленскага універсітэта развіваў дзейнасць па ўзаемнай дапамозе сваім членам, атрымліваючы сродкі ад правядзення мерапрыемстваў і вечарын, а таксама вёў культурна-асветніцкую дзейнасць на тэрыторыі Дзісненскага павета і навакольных. Колькасць членаў гуртка ў розныя часы вагалася ад 20 да 70 чалавек.

Згодна статуту гурток меў апалітычны, культурна-асветніцкі і ўзаемадапамогавы характар. Тэрыторыя, на якую распаўсюджвалася дзейнасць гуртка, пакрывала Дзісненскі павет і суседнія. Мэтамі гуртка было павышэнне маральна-этычнага ўзроўню членаў, фарміраванне грамадзянскага пачуцця, культурна-асветніцкая работа, стварэнне асяродка сяброўскага жыцця, таварыская ўзаемадапамога, падтрыманне членаў матэрыяльна і маральна. Вызначаныя мэты прадугледжвалася дасягнуць праз арганізацыю лекцый, агульнаадукацыйных дыскусій; ладжанне прадстаўленняў, вечарын, канцэртаў, заснаванне бібліятэк, чытальных залаў, праз супрацоўніцтва з асветніцкімі арганізацыямі; арганіза-

[37] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 28
[38] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IA568, арк. 72.
[39] LCVA, ф. 175, воп. 6, спр. VIIB25, арк. 1.
[40] LCVA, ф. 175, воп. 1, спр. IBb712.

цыю таварыскіх сходаў, сумесных экскурсій і падарожжаў[41].

Членам гуртка мог стаць студэнт Віленскага універсітэта на тых жа прынцыпах, што і ў гурток студэнтаў-гродзенцаў. Забаронена было ўступаць у арганізацыю яўрэям.

У 1936 г. пачаў дзейнічаць Студэнцкі гурток развіцця ўсходніх зямель Віленскага універсітэта[42]. Яго мэта — несці асвету сярод насельніцтва ўсходніх зямель Польшчы, якія ўваходзілі ў тэрыторыю Заходняй Беларусі і былі больш адсталымі ў эканамічным і культурным сэнсе ў параўнанні з заходнімі тэрыторыямі польскай дзяржавы. Але зразумела, што асвета гэта была польская па сутнасці і адначасова з адукацыяй несла ў народныя масы, сярод якіх вялікі працэнт быў беларусаў, паланізатарскія тэндэнцыі.

У 4 параграфе статута арганізацыі гаворыцца, што мэтай гуртка з'яўляецца „аб'яднанне польскай моладзі Віленскага універсітэта для працы (...) па ўзмацненню польскасці на ўсходніх крэсах"[43]. Але варта адзначыць, што сярод членаў гэтай праўрадавай арганізацыі былі і беларусы. Напрыклад, Валянцін Смаленскі, студэнт матэматычна-прыродазнаўчага факультэта Віленскага універсітэта, з'яўляўся адначасова і членам БСС. Відавочны працэс апалячвання беларускага насельніцтва, калі, часам, некаторыя асобы самі дрэнна разумелі хто яны — беларусы ці палякі. Хтосьці вёўся за тымі групоўкамі, дзе больш асабістай выгады і карысці. Зразумела, што такія перавагу аддавалі польскім арганізацыям. Яны лепш фінансаваліся і мелі больш шырокія магчымасці, чым, напрыклад, беларускія.

Студэнт матэматычна-прыродазнаўчага факультэта Віленскага універсітэта Браніслаў Корсак з'яўляўся членам як Студэнцкага гуртка развіцця ўсходніх зямель, так і Гуртка студэнтаў-дзіснян Віленскага універсітэта. Ён быў выхадцам з Дзісненскага павета і лічыў сябе палякам.

Польская студэнцкая карпарацыя „Палессе" і па назве, і па сваёй сутнасці была польскай, хоць і аб'ядноўвала студэнтаў Віленскага універсітэта, якія паходзілі з тэрыторый сучаснай паўднёвай Беларусі[44]. Гэта была моладзь, якая карысталася своеасаблівым дыялектам, які аб'ядноўваў некаторыя асаблівасці польскай, беларускай і ўкраінскай моў. Але палітыка польскіх адміністрацыйных улад ды некаторых арганізацый і інстытуцый актыўна імкнулася распаўсюджваць асвету на адсталых усходніх землях па польскаму ўзору. Таму падрастаючае пакаленне, якое ішло вучыцца з палескіх зямель у Віленскі універсітэт, было ўжо з закладзенай у галаву інфармацыяй аб сваім польскім паходжан-

[41] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 32, арк. 98.
[42] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 33, арк. 27.
[43] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 66, арк. 63.
[44] LCVA, ф. 175, воп. 15, спр. 92.

ні. У 8 артыкуле статута студэнцкай карпарацыі „Палессе” гаварылася аб тым, што членам карпарацыі мог стаць кожны студэнт Віленскага універсітэта польскай нацыянальнасці.

Такім чынам, пасля першай сусветнай вайны на тэрыторыі Заходняй Беларусі стварыліся пэўныя ўмовы для развіцця беларускага студэнцкага руху. Адзінай вышэйшай навучальнай установай для заходнебеларускай моладзі стаў Віленскі універсітэт. Польскія законы дазвалялі ствараць студэнцкія аб'яднанні, але з цягам часу ўмовы іх дзейнасці станавіліся ўсё больш жорсткімі і абмежаванымі. Такі ход падзей тлумачыўся пагрозай як з боку камуністаў, нацыяналістаў і іншых палітычных сіл па-за межамі дзяржавы, так і ўнутраным ідэалагічным браджэннем у самой Польшчы. Кароткі агляд беларускага студэнцкага руху Заходняй Беларусі, які быў сканцэнтраваны ў Віленскім універсітэце, дазваляе зрабіць выснову, што нягледзячы на вялікую колькасць перашкод беларуская моладзь і старэйшае грамадства прыкладалі ўсе намаганні для развіцця і пашырэння беларускай нацыянальнай ідэі сярод шырокіх народных мас.

Streszczenie

W 1919 roku odnowił działalność Uniwersytet Wileński, który był jedyną uczelnią na Zachodniej Białorusi. Chłopi białoruscy pozostający w trudnym położeniu socjalnym starali się zapewnić swoim dzieciom jak najlepszą edukację. Dlatego na Uniwersytecie Wileńskim studiowała liczna grupa młodzieży białoruskiej. Uniwersytet stał się ośrodkiem białoruskiego ruchu studenckiego, który był nieodłączną częścią ruchu narodowego. Prawo polskie okresu międzywojennego zezwalało studentom na tworzenie organizacji o różnym charakterze z wyłączeniem działalności politycznej. Najbardziej masową organizacją był Białoruski Związek Studencki. Niektórzy jego członkowie utworzyli później Towarzystwo Przyjaciół Białorusoznawstwa, korporację „Skarynia”, Białoruskie Towarzystwo Studenckie im. Franciszka Skaryny, Białoruskie Studenckie Towarzystwo Krajoznawcze oraz Związek Studentów Ludowców im. Franciszka Bohuszewicza w Wilnie. Główne cele tych organizacji wyznaczała działalność kulturalno-oświatowa, lecz ich członkowie uczestniczyli także w życiu społeczno-politycznym i reagowali na wszystkie wydarzenia w kraju i za granicą. W ramach istniejących organizacji powstawały struktury grupujące studentów na zasadzie terytorialnej. Istniały zatem ziomkostwa reprezentujące studentów z Grodzieńszczyzny, powiatu dziśnieńskiego lub Polesia.